# «Канкрэтная, дзелавая размова»

## ТАКАЯ ДУМКА АБ АБ'ЯДНАНЫМ ПЛЕНУМЕ ЦК І ЦКК КПСС ЯГО ЎДЗЕЛЬНІКА ЧЛЕНА ПАЛІТБЮРО ЦК КПСС, ПЕРШАГА САКРАТАРА ЦК КПБ А. А. МАЛАФЕЕВА

**Матэрыялы апошняга аб'яднанага Пленума ЦК і ЦКК КПСС апублікаваны ў партыйным друку, і ўсё ж кожнага камуніста цікавяць уражанні аб Пленуме яго ўдзельнікаў. Бо зразумела, што сухім афіцыяльным радком інфармацыйнага паведамлення ці скарочаным пераказам выступленняў немагчыма перадаць атмасферу дыскусій, многія яе нюансы.**

**Неўзабаве пасля Пленума журналістам рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі даволі падрабязна расказаў пра яго першы сакратар ЦК КПБ А. А. Малафееў. Нам думаецца, што размова, якая адбылася на прэс-канферэнцыі, можа быць цікавай чытачам «Звязды».**

**— Анатоль Аляксандравіч, Вы былі членам мінулага саставу ЦК КПСС, уваходзіце ў састаў цяперашняга. Які ён зараз, Цэнтральны Камітэт нашай Кампартыі, якія яго адметныя рысы Вы адзначылі б?**

— Апошнія тры Пленумы ЦК былога саставу праходзілі вельмі востра, з высокім крытычным настроем. Выступленні нярэдка адводзілі ад канструктыўнага абмеркавання пытанняў, бо адлюстроўвалі асабістыя пункт погляду і пазіцыі, прычым далёка не бясспрэчныя. Натуральна, што да такой размовы падключаўся Генеральны сакратар, узнікала перапалка. Не заўсёды гэта служыла ісціне.

Новы састаў ЦК адрозніваецца чым? Менш гэтай шматслоўнасці, больш стабільнасці, дынамізму і, я сказаў бы, здольнасці да канкрэтнай дзелавой размовы. А з другога боку, члену ЦК палец у рот не кладзі. У пераважнай большасці членаў ЦК ёсць смеласць, рашучасць адстойваць сваю пазіцыю, абараняць пачуццё ўласнай годнасці.

**— Якая Ваша думка аб дакладзе, з якім выступіў на Пленуме намеснік Генеральнага сакратара ЦК КПСС Уладзімір Івашка?**

— Даклад у прынцыпе атрымаўся. Хаця на яго, відаць, наклалі адбітак асабістыя якасці Уладзіміра Антонавіча. Кожнае слова ў яго ўзважана. Гэта ўвогуле добра, хоць калі-нікалі здаецца празмерным.

Але даклад усё ж адлюстроўваў калектыўную думку. Перад Пленумам Палітбюро разгледзела праект, выказала свае заўвагі, якія былі ўлічаны. Зрэшты, даклад апублікаваны, і Вы можаце скласці аб ім сваё ўражанне. Гэтак жа, як пра выступленні ў спрэчках, хоць яны ў «Правде» скарочаныя, у пераказе. Аднак асноўная лінія кожнага выступлення, пазіцыя членаў ЦК і ЦКК захавана.

**— Чые выступленні Вы асабіста адзначылі б?**

— Мне сваёй глыбінёй, грунтоўнасцю, лагічнасцю спадабалася выступленне першага сакратара Маскоўскага гаркома партыі Пракоф'ева. Добра выступіў шахцёр з Данбаса Жыганаў. Безумоўна, агульная ўвага была да выступлення Палазкова ў сілу зразумелых вам прычын. Ім было выказана нямала і спрэчных думак. На слых залай добра ўспрымалася яго канстатацыя, што перабудова ў тым выглядзе, у якім задумвалася, не атрымалася. Як заўсёды, прыцягнула ўвагу слова Барыса Алейніка. Я сказаў бы, што ён — сумленне нашага часу, хоць асэнсаванне працэсу перабудовы для яго далёка не простае. Галоўнае, што ім кіруе,—чалавечая праўдзівасць. Гэта, думаю, і для пісьменніка, і для журналіста самае галоўнае.

**— У інфармацыйным паведамленні аб Пленуме асобна вылучана пытанне пра члена ЦК КПСС акадэміка Шаталіна. Рэдкі выпадак для нашых Пленумаў. За апошні час можам успомніць хіба што гісторыю з Ельцыным...**

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы